УДК 378.147

# ПРЫМЯНЕННЕ ІНАВАЦЫЙНЫХ ВУЧЭБНЫХ СРОДКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦІПЛІНЫ «МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ МУЗЫКІ З АСНОВАМІ МУЗЫКАЗНАЎСТВА»

**Каваліў Валянцін Васільевіч**

дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца інавацыйныя вучэбныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца аўтарам у працэсе выкладання дысцыпліны «Методыка выкладання музыкі з асновамі музыказнаўства».

**Ключавыя словы:** падрыхтоўка настаўніка пачатковых класаў, методыка выкладання музыкі, інавацыйныя вучэбна-метадычныя сродкі.

Адным са шляхоў забеспячэння патрабаванняў сучаснасці да падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшай прафесійнай адукацыі з'яўляецца стварэнне і ўкараненне ў работу новых сістэм кіравання якасцю адукацыі. Сярод асноўных напрамкаў, якія зараз усё больш актыўна распрацоўваюцца і ўкараняюцца ў навучальны працэс вышэйшай школы, з'яўляецца выкарыстанне новых інавацыйных вучэбных сродкаў, якія садзейнічалі б больш поўнаму раскрыццю зместу выкладаемай дысцыпліны, павышэнню цікавасці студэнтаў да выкладаемага матэрыялу і тым самым паляпшэнню падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

На працягу апошніх некалькіх гадоў аўтарам артыкула быў распрацаваны (як асабіста, так і ў суаўтарстве) цэлы шэраг вучэбна-метадычных сродкаў, накіраваных на ўдасканаленне падрыхтоўкі будучых настаўнікаў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі да выкладання вучэбнага прадмета «Музыка». У адпаведнасці з вучэбным планам асноўнай дысцыпліны, падчас якой будучыя настаўнікі пачатковых класаў знаёмяцца з асновамі выкладання дадзенага прадмета ў школе, з'яўляецца «Методыка выкладання музыкі з асновамі музыказнаўства».

Галоўным інавацыйным вучэбна-метадычным сродкам у выкладанні вышэйназванай дысцыпліны на сённяшні дзень можна лічыць інтэрактыўны электронны вучэбна-метадычны комплекс «Методыка выкладання музыкі з асновамі музыказнаўства», размешчаны на платформе МУДЛ БДПУ. Дадзены курс распрацаваны ў суаўтарстве з выкладчыкамі кафедры педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі факультэта пачатковай адукацыі БДПУ С. М. Пацкевіч і А. С. Бойка [5].

Комплекс уключае ў сябе цэлы шэраг арганізацыйных, тэарэтычных, практычных і кантралюючых матэрыялаў, накіраваных на вывучэнне прадстаўленай дысцыпліны. У працэсе яго стварэння былі выкарыстаны такія інавацыйныя

прынцыпы ў навучанні, як інтэрактыўнасць, інфармацыйная адкрытасць і дыстанцыйнасць.

Структура ИЭУМК уключае ў сябе арганізацыйна-метадычны модуль, два навучальныя раздзелы і выніковы модуль.

У склад арганізацыйна-метадычнага модуля ўваходзяць:

1. Вучэбная праграма па дысцыпліне.
2. Пералік фарміруемых кампетэнцый.
3. Метадычныя ўказанні па вывучэнні курса.
4. Вучэбна-метадычныя карты для дзённай і завочнай формы атрымання адукацыі.
5. Гласарый курса «Методыка выкладання музыкі з асновамі музыказнаўства».

Першы раздзел «Асновы музыказнаўства» змяшчае лекцыі з уключанымі ў іх кантрольнымі пытаннямі, мультымедыйныя прэзентацыі, матэрыялы і пытанні да практычных заняткаў, кантрольныя пытанні і тэсты па вывучаемых тэмах, спісы музычных твораў для вывучэння, музычныя віктарыны. Завяршаецца раздзел форумам для абмеркавання пытанняў па тэмах раздзела.

Асноўнымі структурнымі кампанентамі другога раздзела «Методыка выкладання музычнага мастацтва ў пачатковай школе» таксама з'яўляюцца лекцыі з уключанымі ў іх кантрольнымі пытаннямі, матэрыялы і пытанні да практычных заняткаў, кантрольныя пытанні па вывучаных тэмах і заданні да самастойнай працы. У канцы раздзела – выніковы тэст па вывучаных тэмах.

Завяршаецца комплекс выніковым модулем, які ўключае ў сябе тэст па ўсёй дысцыпліне, пытанні да заліку, а таксама анкету, мэтай якой з'яўляецца вывучэнне меркаванняў студэнтаў аб змесце дысцыпліны і якасці яе выкладання.

Да іншых вучэбна-метадычных сродкаў можна аднесці цэлы шэраг аўтарскіх навучальных дапаможнікаў на друкаванай аснове, якія выйшлі за апошнія некалькі гадоў. Усе яны выкарыстоўваюцца з мэтай практычнага асваення студэнтамі зместу вучэбнага прадмета «Музыка». Да іх адносяцца працоўныя сшыткі і тэсты па вучэбным прадмеце «Музыка» для кожнага з чатырох класаў пачатковай школы, складзеных у поўнай адпаведнасці з вучэбнай праграмай па вучэбным прадмеце «Музыка» [6-13].

Дзякуючы выкарыстанню гэтых дапаможнікаў, навучальны працэс арганізуецца такім чынам, што ўсе студэнты аказваюцца ўцягнутымі ў практычнае вывучэнне зместу прадмета «Музыка». Тым самым, яны маюць магчымасць разумець, як адбываецца працэс навучання на ўроку, рэфлектаваць з гэтай нагоды, усведамляючы, што яны ведаюць, а над чым яшчэ трэба папрацаваць.

Адметнай асаблівасцю выкарыстання на практычных занятках прадстаўленых дапаможнікаў з'яўляецца таксама тое, што матэрыялы, уключаныя ў іх, дэманструюцца і вывучаюцца са студэнтамі не толькі агульнапрынятым спосабам (выкананне заданняў у саміх дапаможніках на друкаванай аснове), але і з выкарыстаннем мультымедыйных тэхналогій у выглядзе прэзентацый, распрацаваных у праграме PowerPoint. Названыя прэзентацыі складаюцца з

аўдыёфайлаў музычных твораў, уключаных у працоўныя сшыткі і тэсты. Гэта дазваляе адразу ж дэманстраваць і абапірацца на музычныя прыклады, якія адносяцца да таго ці іншага задання. Таксама гэта дае магчымасць мабільна знаёміць студэнтаў з музыкай, якая вывучаецца на ўроках, пашыраючы іх уяўленні пра музычны змест вучэбнага прадмета. У рамках самастойнай працы студэнтаў ім даецца магчымасць слухаць і спампоўваць вышэйназваныя аўдыёфайлы, выкарыстоўваючы для гэтага воблачнае сховішча.

Сярод іншых распрацаваных інавацыйных вучэбна-метадычных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца на практыцы пры вывучэнні дысцыпліны «Методыка выкладання музыкі з асновамі музыказнаўства», варта назваць:

– стварэнне і прымяненне інтэрактыўных модуляў да электроннага вучэбна-метадычнага комплексу па вучэбным прадмеце «Музыка», размешчаных на сайце НДА [1-4];

– уключэнне ў заняткі спецыяльна падабраных і адрэдагаваных відэафрагментаў урокаў музыкі з іх наступным аналізам і абмеркаваннем;

– размяшчэнне аўдыёфайлаў музычных твораў на сэрвісе Google дыску з іх наступным выкарыстаннем пры рашэнні пастаўленых перад студэнтамі задач;

– прымяненне магчымасцей дадатку Viber для прадастаўлення студэнтам фатаграфій, дыдактычных матэрыялаў, а таксама спасылак на неабходныя для работы крыніцы;

– размяшчэнне матэрыялаў і заданняў у блогу выкладчыка на сайце БДПУ https://bspu.by/blog/kovaliv, а таксама на асабістым афіцыйным сайце http://i29685jf.beget.tech/ у раздзеле «Настаўнікам і студэнтам»;

– падбор, паказ і аналіз відэакліпаў да музычных твораў, размешчаных у відэахостынгу Ю-Туб.

– выкарыстанне відэаматэрыялаў праекта «Песні ў фарбах», размешчаных на асабістым афіцыйным Ю-Туб канале https://www.youtube.com/@ValentinKovaliv

## Спіс літаратуры


1. Ковалив, В. В. Интерактивный модуль электронного учебно-методического комплекса по учебному предмету «Музыка»: 1 класс. Звучащий мир вокруг нас. Вокальное произведение «Где живёт музыка» (муз. и сл. Валентина Ковалива) / В. В. Ковалив // Нац. ин-т образования Респ. Беларусь [Электрон. ресурс]. – Режим доступа: http://e-vedy.adu.by/course/view.php?id=161 – Дата доступа: 10.02.2024.
2. Ковалив, В. В. Интерактивный модуль электронного учебно-методического комплекса по учебному предмету «Музыка»: 2 класс. Мелодия – королева музыки. Вокальное произведение «Песенка о гномиках» (муз. и сл. Валентина Ковалива) / В. В. Ковалив // Нац. ин-т образования Респ. Беларусь [Электрон. ресурс]. – Режим доступа: http://e-vedy.adu.by/course/view.php?id=163 – Дата доступа: 10.02.2024.
3. Ковалив, В. В. Интерактивный модуль электронного учебно-методического комплекса по учебному предмету «Музыка»: 3 класс. Трёхчастная форма. Вокальное произведение «Шумный Ба-Бах» (муз. Валентина Ковалива, сл. Джеймса Ривза в переводе с английского Марины Бородицкой) / В. В. Ковалив [Электрон. ресурс]. – Режим доступа: http://e-vedy.adu.by/course/view.php?id=162 – Дата доступа: 10.02.2024.

4. Ковалив, В. В. Интерактивный модуль электронного учебно-методического комплекса по учебному предмету «Музыка»: 4 класс. Осенние песни. Вокальное произведение «Гусанькі» (муз. Валентина Ковалива, сл. Станислава Шушкевича) / В. В. Ковалив // Нац. ин-т образования Респ. Беларусь [Электрон. ресурс]. – Режим доступа: http://e-vedy.adu.by/course/view.php?id=382 – Дата доступа: 10.02.2024.

5. Ковалив, В. В. Методика преподавания музыки с основами музыковедения : интерактивный электронный учебно-методический комплекс по учебной дисциплине для специальности 1-01 02 01 “Начальное образование” [Электронный ресурс ] / В. В. Ковалив, С. М. Пацкевич, Е. С. Бойко // БГПУ. – 2016. – Режим доступа: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=5755. – Дата доступа: 10.02.2024.

6. Ковалив, В. В. Музыка. Рабочая тетрадь. 1 класс : пособие для учреждений общего образования с русским языком обучения / В. В. Ковалив, А. Ю. Ковалив. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2023. – 5-е изд., перераб. и доп. – 40 с.

7. Ковалив, В. В. Музыка. Рабочая тетрадь. 2 класс : пособие для учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / В. В. Ковалив, А. Ю. Ковалив. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2023. – 5-е изд., пересмотр. – 40 с.

8. Ковалив, В. В. Музыка. Рабочая тетрадь. 3 класс : пособие для учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / В. В. Ковалив. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2023. – 5-е изд. – 40 с.

9. Ковалив, В. В. Музыка. Рабочая тетрадь. 4 класс : пособие для учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / В. В. Ковалив. – Минск : Адукацыя і выхаванне. – 2023. – 5-е изд., пересмотр. – 40 с.

10. Ковалив, В. В. Музыка. 1 класс : тесты / В. В. Ковалив, С. М. Никитенко. – Минск : Аверсэв, 2022. – 32 с. : ил.

11. Ковалив, В. В. Музыка. 2 класс : тесты / В. В. Ковалив. – Минск : Аверсэв, 2022. – 48 с. : ил.

12. Ковалив, В. В. Музыка. 3 класс : тесты / В. В. Ковалив. – Минск : Аверсэв, 2022. – 32 с. : с ил.

13. Ковалив, В. В. Музыка. 4 класс : тесты / В. В. Ковалив. – Минск : Аверсэв, 2022. – 48 с. : ил.